LIETUVOS RESPUBLIKOS ŠVIETIMO IR MOKSLO MINISTERIJA
NACIONALINIS EGZAMINŲ CENTRAS

2008

# BALTARUSIŲ GIMTOJI KALBA

Mokyklinio brandos egzamino užduotis

Pagrindinė sesija

**I egzamino dalis**

## Rašinių temos ir tekstai interpretacijai

**2008 m. gegužės 19 d.** **Trukmė 3 val.**

### ТЭМЫ САЧЫНЕННЯЎ

1. Вобраз маладой Беларусі ў зборніку вершаў Я. Купалы “Спадчына”.
2. Рамантычны герой у рамантычных абставінах (па раману У. Караткевіча “Каласы пад сярпом тваім”).
3. Чалавек перад выбарам (па творах В. Быкава).

### ТЭКСТЫ ДЛЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫІ

***1. Максім Багдановіч***

Дождж у полі і холад... Імгла...
Дзесь у вёсцы міргаюць агні.
Там, злякаўшысь, схавалась, лягла
Доля горкая ў чорным цяні.

І пад цёмнымі скрыдламі ночы
Не убачаць цяпер яе вочы.

Толькі вецер асенні, начны
Ў полі сумна гудзіць і пяе
Аб радзімай старонцы глухой
Ды аб долі няшчаснай яе.

Цісне сэрца мне песня начная...
Хай жа голасна вецер спявае,

Хай пяе ён у роднай зямлі,
Каб у сэрцах нам сорам збудзіць,
Каб змагацца з няпраўдай ішлі,
Ў чыім сэрцы сумленне не спіць.

Долю чорную ноч не схавае,
Калі выльецца песня жывая!

© Nacionalinis egzaminų centras, 2008

*2. Змітрок Бядуля*

## ЗАГАДКА

Вытапталі мы сабе месца сярод высокай травы на лузе ля ракі і селі, нібы ў шатры. Млела блізка рэчка сярод цішы летняй ночы, і праменні месяца залацілі нямы чарот...

Маўчала яна... Толькі сэрца маё не маўчала. Мне хацелася нешта казаць ёй, але не ведаў я што.

– Загадай загадку! – выпаліў я раптам ні з таго ні з сяго.

Зірнула яна на мяне, а ў гэты самы момант месяц зірнуў на яе. Шаўковымі хвалямі былі распушчаны валасы па плячах. Ад іх ляглі на твары паўцені, і вочы глыбокімі зрабіліся, а яна зрабілася таемнай - здаецца, любіла і не любіла, жартавала і не жартавала, не то клікала да сябе, не то адганяла... І я не мог разгадаць...

Нямела ноч. Чорныя вольхі драмалі. Адны зоркі гаслі, другія запаліліся.

Я не ведаў, ці мне ў нейкім забыцці, быццам мармуровую багіню, цалаваць яе, ці адвярнуцца ад яе і захаваць у сэрцы маладое, шчырае пачуццё...

Яна загадала загадку...

*3. Уладзімір Караткевіч*

## ВЯСНА ЎВОСЕНЬ
### *Казка*

Маленькі Янка цяжка захварэў. Ляжыць увесь чырвоны, нічога не бачыць і не чуе. Нават Аленкі не пазнае. І не ведае яна, чаго дактары ў доме. Чаго мама плача, калі думае, што ніхто не бачыць яе?

А Янку здаецца: шуміць цёмнае мора пад хмарамі. Ад берага адплываюць чорныя караблі, і завозяць яны некуды ў свет усе ягоныя цацкі. Вось салдацікаў павезлі. Ну хай салдацікаў. А нашто яны Мішку забіраюць? Заўтра дзень нараджэння, а Янка з ім нават не пагуляў...

– Можа, ты хочаш чаго, сынок? – спыталася мама.

– Сонейка, – сказаў Янка. Нават вачэй не расплюшчыў.

Якое там сонейка! Восень. Льюць шэрыя дажджы. На клёнах дурное лісце. Дурное, бо даўно яму трэба ўпасці.

Ніхто не глядзіць на Аленку. Узяла яна плашчык ды выйшла з хаты ў сад. Сонейка шукаць, браціка ратаваць.

У дварэ вецер моршчыць лужыны. Усе птушкі, усе мушкі, усе звяркі пахаваліся. Хто дрыжыць, хто дзесьці сон бачыць.

– Сонейка-Сонейка, выйдзі, – папрасіла Аленка. – Цябе брацік кліча.

– Сплю, – сказала Сонейка з-за хмар. – Мяне кожны ранак птушкі будзяць. А цяпер іх няма. Хто на поўдзень паляцеў, хто ў дупло схаваўся. Нікога я ўжо да вясны не сагрэю.

– Птушкі, звяркі, мушкі, разбудзіце Сонейка!

– Спім. Холадна, – адказалі жабкі з дна ракі, грыбы – з-пад зямлі, вавёркі – з дуплаў.

– Разбудзіце Сонейка, – папрасіла Аленка. – Брацік Сонейка хоча.< >

– …Ён нас не крыўдзіў, – сказаў Шчыгол.

– Ён і мне ўзімку сала за акно вешаў, – ціўкнула Сінічка – салатная грудка.

– А нам семак сыпаў, – адгукнуліся шчыглы. Вядома, дзе адзін шчыгол, там і дзесяць.

– Не будзем часу марнаваць, – сказаў Заяц з лесу. – Як нам ні холадна, а трэба памагчы чалавеку.

Упаў на зямлю адзін сонечны прамень. Гэта Сонейка зацікавілася: што там за вясенні канцэрт?< >

– Сонейка-Сонейка, – Папрасіла Аленка, – Глянь на брацікa ў акенца.

Сонейку што, яно і туды зірнула. Заблішчалі шыбы.< >

Разгаралася Сонейка. І спяшаліся з падарункамі да Янкі госці. Хто прынёс моркву? Заяц. Хто вясёлыя бурбалкі? Рыбкі. Прынесла вавёрка арэхаў горку. А клюшню прынёс рак... Вось так.

І сталі ўсе яны разам з Сонейкам глядзець у акно. < >

І тады Аленка пакланілася ім. Заплакала. З радасці.

Сказалі зайцы: мы вас бегаць навучым. Рыбы: плаваць навучым. Бабры: ныраць навучым. Грыбы: расці навучым... Вось так.

І ўсе, разам з Сонейкам, сказалі: разумнымі быць навучым. За дабрыню да ўсіх.

Зайшла Аленка ў хату. < >А Янка-брацік спаў. І плылі да яго пад Сонейкам, вярталіся светлыя караблі. Везлі назад цацкі. Везлі вясёлага Мішку, з якім ён будзе гуляць у дзень нараджэння. І ведалі ўсе, што яшчэ сто дзён нараджэння будзе ў хлопчыка ў жыцці…

І Аленка ведала, што нікому ніколі, нават калі будзе сівой бабуляй, яна не раскажа, хто ў той асенні дзень вярнуў на хвіліну Вясну і Сонейка.